НАША БУДУЧЫНА

Цана асобнага нумару 150 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільна, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкаў да хаты 600 м. п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вертаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 400 мк., сярод тэксту 600 мк. і на апошняй страніцы 200 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 2. **Субота, 16-га сьнежня 1922 г.** **Год I.**

Будзьма сільнымі.

Спаміж тых гаспадарстваў, якія заўладалі часьцінамі Беларускае Зямлі, ў гэты мамэнт асаблівую ўвагу кожнага беларуса зварачывае на сябе Польская Рэспубліка: тутака беларускае насяленьне знаходзіцца ў найгоршых варунках і тутака, ня гледзячы на гэта, яно толькі што адсьвяткавала сваю хоць ня поўную, але першую пабеду на дарозе констытуцыйнае барацьбы за сваі правы—на выбарах паслоў у Сойм і ў Сэнат.

Беларуская пабеда паказала ўсяму сьвету, што, ня гледзячы на розныя фальшаваныя статыстыкі, беларусы становяць у межах Польскага гаспадарства чысьленую групу насяленьня. Паказала яна яшчэ і другое: што гэта група, на пагляд такая неарганізаваная, распыленая на вялізерным абшары па шэрых вёсках і хутарох падзеленая на дзьве рэлігійныя групы—каталіцкую і праваслаўную, у патрэбны мамэнт умее выступаць дружна, у абароне сваіх паслоў, за долю і волю.

На гэта апошняе нам і трэба зьвярнуць у гэты мамэнт асаблівую увагу: у Польшчы пачынаюць тварыцца рэчы, якія быццам далёкі гром, весьцяць прыбліжэньне грознае навальніцы,—і ў гэтую навальніцу мы павінны больш, чым калі быць дружнымі і моцнымі.

9 сьнежня ў Варшаве сабраліся разам паслы Сойму і сэнаторы на Нацыянальны Сход, каб выбраць прэзыдэнта Польскае Рэспублікі. Пасьля доўгага кіданьня шароў выявілася, што правыя йдуць зусім солідарна за кандыдатурай эндэка, графа Замойскага, які зьяўляецца польскім паслом у Парыжу. Левыя-ж партыі і нацыянальныя меншасьці ішлі за рознымі кандыдатурамі, пры чым апошнія падтрымлівалі вядомага паступовага прафесара Бодуэн-дэ-Куртэнэ. У рэзультаце ніводзін кандыдат ня мог атрымаць патрэбнае па закону лічбы галасоў. Тагды нацыянальныя меншасьці пастанавілі аддаць свае галасы за кандыдата левых Г. Нарутовіча, дагэтуль міністра заграничных спраў,—і апошні быў выбраны за прэзыдэнта.

Аднак, гэта паслужыла для эндэкаў сыгналам да выступленьня проці новага прадстаўніка найвышэйшае ўлады ў гаспадарстве. 11 сьнежня на вуліцы польскае сталіцы выступілі эндэцкія „баёўкі“, якія пачалі нападаць на левых паслоў і сэнатараў і біць іх да бязпрытомнасьці. Пасол Пятроўскі тры гадзіны пралежаў бяз памяці. Паслоў Дашынскага і Яворскага ды сэнатора Ліманоўскага (усе соцыялісты) эндэцкія „баёўкі“ прадзержылі паўтары гадзіны ў асадзе ў адным доме, куды тыя схаваліся ад нападу эндэкаў. Толькі прыход грамады работнікаў-соцыялістаў прымусіў бандытаў пакінуць сочаныя ахвяры,—але затое яны пачалі абстрэліваць работнікаў. На вуліцах Варшавы палілася кроў. Паліцыя ... чале якой стаяць эндэкі, спакойна угледалася на разбоі „баёвак“, ... торыя пачалі кідаць сьнежкамі ... самога прэзыдэнта, як той ех... Сойму пасьля прысягі на верн... ць Конституцыі.

Разрухі прынялі сур'ё...ю форму толькі дзякуючы становішчу, якое заняла паліцыя. З гэтай прычыны міністар унутраных спраў, Камінскі, ў той-жа дзень быў прымушаны падацца ў адстаўку. Камэндант паліцыі Сікорскі выдалены са службы і аддадзены пад суд, а пракурор загадаў яго арыштаваць. Камісар места Варшавы таксама выдалены.

Ды ня гэта ў канцы канцоў важна. Важна перш-на-перш тое, што, як зусім правільна піша „Robotnik“, правыя партыі адкрыта выступілі проці Конституцыі Польшчы і проці ўсяе дэмакратыі, што партыйная барацьба за ўладу абярнулася ў грамадзянскую вайну. Куды яна завядзе Польшчу—прарочыць рана.

Важна яшчэ і другое. Гэта-тое, што правыя зусім адкрыта кінулі свой кліч вынішчэньня „інародцаў“ і пазбаўленьня іх усялякіх правоў у гаспадарстве. „Польшча для палякаў“!—пад такім лёзунгам ідуць польскія эндэкі,—тыя эндэкі, што дамагаліся далучэньня да Польскага гаспадарства якраз няпольскіх зямель—з беларускім і украінскім насяленьнем. „Польшча для палякаў!“—гэты кліч паказуе ўсяму сьвету, што польскі нацыяналізм сьмяецца і з Вэрсальскага Трактату, які абязывае Польскую Рэспубліку шанаваць правы няпольскага насяленьня, і з Рыжскае умовы, якая гаворыць спэцыяльна аб правох беларусаў, і з сваей-жа польскай констытуцыі, якае забясьпечывае роўныя правы для ўсіх нацыянальнасьцей у межах гаспадарства. „Інародцы“—гэта „унутраны вораг“, кажа проста „Rzeczpospolita“.

І гэты кліч прымушае нас, беларусаў, у гэты мамэнт аб'яднаць і напружыць усе нашы сілы, каб у часе барацьбы між правымі і польскай дэмакратыяй абараніцца ад усялякай напасьці, удараў і правакацыі з боку рэакцыі. Гэты кліч паказвае, што за пабедай рэакцыі пачнецца паход проці нашага народу—паход, пробу каторага мы ўжо бачылі ў часе выбараў.

„Будзьма сільнымі!“—вось наш кліч на сягоньняшні дзень.

✦✦✦✦

Барацьба за незалежнасьць.

Вялікая сусьветная вайна і соцыяльныя рэвалюцыіпа ўсей Эўропе разбудзілі самыя занепаўшыя ў культурным разьвіцьці і палітычным становішчы народы да барацьбы за сваю незалежнасьць, за вызваленьне з пад чужацкай апекі і пашырылі, углубілі гэтую барацьбу там, дзе яна ўжо была. Напрыклад беларусы, яшчэ ў 1917 годзе ў часопісі „Вольная Беларусь“ дамагаліся толькі аўтаноміі, а ў 1920 годзе ўжо палілася беларуская кроў у барацьбе за незалежнасьць сваей Бацькаўшчыны.

За гэты час і ў тэорыі, і ў практыцы жыцёвай выдзеляецца шмат мейсца аб адраджэньні народаў, аб провах прыгнечаных нацыянальнасьцях. Ад самых левых соцыялістычных кірункаў да самых правых—усе ўразумелі і прызналі жыцьцёвасьць ідэі адраджэнскага руху і стаяць у абароне праў нацыянальных меншасьцей. Ленін пасьвячае гэтаму пытаньню цэлы том (VIII), даючы шырокае талкаваньне нацыянальнаму пытаньню, прызнаючы патрэбнасьць кожнаму народу самому і незалежна тварыць сваю ўласную культуру, а не пазычаць яе ў чужых, ня быць гноем для чужой культуры. Нацыянальнае „я“ павінна адрадзіцца і сказаць сваё слова. Нават сярод польскага грамадзянства ўсё часьцей-гусьцей прыходзіцца чуць трэзвы, здаровы пагляд на нацыянальнае пытаньне. Моцны публіцысты Ст. Буковецкі ў сваей новай кнізе „Polityka niepodległej Polski“ стаіць за тое, каб дапамагчы Беларусі і Украіне стаць незалежнымі і гэтым ліквідаваць адвечныя звадкі паміж Польшчай і Расеяй за гэтыя землі.

Не кажучы ўжо аб безупыннай крывавай барацьбе за сваю незалежнасьць Ірляндыі і Галіччыны, Мароко супроць Гішпанцаў, а таксама ў Індыі, Месапатаміі, Сырыі, Ягіпце, але нават і негры разварушыліся.

Нядаўна ў Нью-Іорку адбыўся зьезд нэграў. Зьезд гэты праз сваіх дэлегатаў прадставіў Саюзу Народаў свае дамаганьні ад імя 150 мільёнаў чорнай расы. Негры дамагаюцца, каб ім перадалі некалькі быўшых нямецкіх калёній у Афрыцы, дзе яны і заложуць незалежную дзяржыву. У Афрыцы цяпер ідзе энэргічная прапаганда за вызваленьне дробных народаў Афрыкі. У адозвах і лістоўках стаіць кліч: „Афрыка—афрыканцам!“ Асабліва рашуча і востра выступаюць Сенегальцы.

Яшчэ ў 1920 годзе ў горадзе Акра, на беразе Гвінейскай затокі адбылася канфэрэнцыя на якой дамагаліся аўтаноміі для „чорнага насяленьня“ і англійскі ўрад змушаны быў уступіць і даць абяцанкі. Учарашнія чорныя рабы пазналі сабе цану і дамагаюцца належачых ім праў чалавека. Аўторытэт вялікіх эўрапэйскіх дзяржаў, а ў апошнія часы Ліга Нацыяў ужо траціць значэньне ў нэграў і адраджэнскі вызвольчы іх рух прыймае большую арганізованасьць і адналітасьць. Зразумела, што калі не наступіць крутой перамены ў сучаснай палітыцы што да нацыянальнага пытаньня, ня ўціхне ўціск падняволеных народаў, дык перад намі бурлівая будучына.

Нават нэгры зразумелі, што толькі самі сваімі рукамі можна збудаваць сваю хату і стварыць свой дабрабыт.

Р. Ю.

У справе беларускай школы.

ГРАМАДЗЯНЕ! Неадкладаючы памажыце зьбіраць матэр'ял для ўнясеньня інтэрпеляцыі (запытаньне) у Сойме ў справе беларускага школьніцтва.

Трэба падаць на пісьме за ўласнаручным подпісам і адрасам адказы на гэткія запытаньні:

1. Ад якога району (вёска, воласьць, павет) і калі падавалі заяву аб адчыненьні беларускае школы?
2. Як прозьвішча павятовага школьнага інспэктара, на рукі якога складалі прыгавор?
3. Колькі было подпісаў пад прыгаворам.
4. Колькі больш-менш лічыцца дзяцей школьнага ўзросту ў районе, ад якога пададзены быў прыгавор.
5. Чаму не адчынена беларуская школа (якія ставіліся перашкоды, аўтэнтычныя адказы на словах або на пісьме павятовага інспэктара, дэлегацыі ад сялян і колькі разоў зьверталіся ў гэтай справе да інспэктара)?

Акуратныя праўдзівыя спраўкі трэба **неадкладаючы** пасылаць у Беларускую Цантральную Школьную Раду (Wilno, ul. Wileńska 12—6) або проста ў Прасьветную Сэкцыю Бел. Пасольск. Клюбу (Warszawa, ul. Wiejska, Sejm Rzeczypospolitej Polskiej, Białoruski Klub Poselski. Poseł Szymon Rak-Michałowski).

✦✦✦✦

Палітычныя падзеі.

З Літвы.

9 сьнежня адбыліся выбары прэзыдэнта Літоўскай Рэспублікі. Выбраны б. пасол у Лёндыне Нарушэвіч.

Лозанская канфэрэнцыя.

Ідуць перагаворы аб пралівах. Прадстаўнікі Расеі патрабуюць, каб па пралівах мелі свабодны праход толькі гандлёвыя караблі без вайсковых і каб справа аб пралівах вырашылася пры ўчасьці прадстаўнікоў Расеі, Украіны і Грузыі, як дзяржаў зацікаўленых у гэтым пытаньні. На выпадак адмовы Чычэрын пагражае склікаць новую канфэрэнцыю з дзяржаў, прылегаючых да чорнага мора.

Маскоўская конфэрэнцыя.

Маскоўская канфэрэнцыя, якая зьехалася, каб разгледзіць пытаньне аб умяншэньні войска і разбраеньні, зачынілася не дайшоўшы да пажаданых вынікаў.

Рэпрэсыі ў Галічыне.

Жудасныя крывавыя падзеі ідуць цяпер на Галічыне. Украінцы дамагаюцца незалежнасьці Галічыне. Пытаньне гэтае ўжо паднімалася на ўсякіх канфэрэнцыях, у Лігі Народаў, у Польскім Сойме і так да гэтага часу яшчэ ня вырашана. Цярпеньне народу лопнула. Усе галіцкія газэты перапоўнены аб крывавых забурэньнях. Чым больш рашуча выступае народ з сваімі дамаганьнямі, тым страшнейшыя ідуць рэпрэсыі. Усё украінскае безашчадна нішчыцца. Астрогі перапоўнены арыштаванымі.

Вядомы музыкант Міхал Гайваронскі быў арыштаваны на вуліцы гор. Львова за тое, што гутарыў паукраінску. Заведзяны ў вучастак быў абрэвізаваны, у яго памешканьні таксама быў зроблены вобыск і ўрэшце М. Гайваронскага выпусьцілі на волю. Па гэтаму здарэньны чытач зможа дапоўніць сабе абраз таго, што дзеецца з барацьбістамі за волю, за вызваленьне, што дзеецца на вёсках, дзе кожны паліцыянт „цар і бог“.

З Ірляндыі.

Англійскі кароль падпісаў дэкрэт, які праводзіць у жыцьцё Ірляндскую Канстытуцыю.

Ня так, як у нас.

У гор. Ужгородзі на Падкарпатцкай Украіне, якая належыць да Чэхаславацкай рэспублікі адбылася ў верасьні канфэрэнцыя сацыял-дэмакр. укр. партыі. На канфэрэнцыі былі прысутнымі і паслы Чэхаславацкага парлямэнту. Адзін з паслоў Бэхінэ выдатны дзеяч, ён жа кірue сучаснай чэскай палітыкай, сказаў да урадовых вураднікаў, што працуюць на Падкарпатчыне.

„Памятайце паны вураднікі, што вас наша рэспубліка паслала на Падкарпатцкую Украіну не на тое, каб вы панавалі, але каб вы працавалі. Вы павінны быць заступнікамі гэтага народу, даваць яму раду, вучыць яго. Не павінна быць такіх, якія хацелі-б пажывіцца на украінцах і Падкарпатчыну лічымі калёніяй Чэскай рэспублікі, бо гэтым рабілі-б аграмадную шкоду ня толькі украінцам, але і цэлай рэспублікі. Шчырай, сумленнай працай, а не чым іншым павінны вы здабываць прыхільнасьць тутэйшага народу. Хто з вас такой прыхільнасьці не здабудзе, той дае доказ, што ня можа або ня хоча працаваці для дабра гэтага народу і для дабра ўсей рэспублікі“.

З гэтага мы бачым, што зусім іншыя як у нас істнуюць адносіны да нацыянальных меншасьцяў у рэспубліках, дзе пануе больш-менш лад і справядлівасьць.

Украінскі пасол у вастрозе.

Нядоўна выбраны ў Сойм украінец Марка Луцкевіч, пасаджаны палякамі ў вастрог. Арыштаваны аб'явіў галадоўку як пратэст супроць гэткага беззаконьня. Прад'яўлены акт абвінавачаньня ў польскай мове Луцкевіч ня прыняў, патрэбуючы састаўленьня акта паукраінску.

Зьезд Каўказскіх рэспублік.

10 га сьнежня ў г. Баку (Азербейджан) распачаўся зьезд Каўказскіх рэспублік. Мэта зьезду разгледзіць праект фэдэрацыі савецкіх рэспублік на Каўказе і апрацаваньне канстытуцыі для гэтай фэдэрацыі.

✦✦✦✦

На коопэратыўныя тэмы.

Улада і коопэрацыя.

Як польская афіцыяльная улада, так і грамадзянская апінія страшэнна клапацяцца аб тым, каб хоць знадворку выглядала, што ў Польшчы поўная забясьпечанасьць асабістых правоў і грамадзкая вольнасьць і цярпімасьць адносна да ўсіх меньшасьцяў.

Год назад Кангрэс Паміжнароднага Коопэратыўнага Саюзу вынес рэзалюцыю пратэсту проціў гвалтаў, якія улада учыняе над украінскай коопэрацыяй ў Галіччыне. Афіцыяльныя і неафіцыяльныя прадстаўнікі Польшчы і Зьезд польскіх коопэратываў паднялі вялікі крык, а нават дабіліся, што Сэкрэтарыят Паміжнароднага Саюзу напісаў пісьмо, у якім прызнае, што падобныя пастановы павінны прымацца з большай асьцярожнасьцю і увагай. Хоць ў пісьме няма ні слоўка аб прызнаньні прынятай Кангрэсам рэзалюцыі за неправідловую, але польская коопэрацыя задаволена такім аканьчаньем справы аб „недаведзяных прасьледаваньнях галіцыйскай коопэрацыі“, як выразіўся X Зьезд Саюзу Польскіх Коопэратываў.

Ня ведаем, шчыра ці няшчыра кажа польская коопэрацыя, што усё там добра ў стасунках паміж уладай і коопэрацыяй (асобліва, няпольскай), а у іх, у Віленшчыне справа стаіць іначай.

Трэба прызнацца, што выразна-нацыянальнай беларускай коопэрацыі ў нас няма. І няма па той простай прычыне, што улада, такая прыхільная ў Галічыне, у нас проста з мосту не рэеструе статутаў на беларускай мове, а нават калі угледзіць за польскім статутам дух беларускай самадзеяльнасьці, дык коопэратыў на замок, пад чырвоную пячатку, бо прычына заўсёды знойдзецца, то кіраўнік мае зносіны з бальшавікамі, то старшыня ў хуткім часе будзе аддадзены пад суд за няведаны праступак.

Гэта не жарты, а факты...

Так стаіць справа на мейсцох, аб гэтым можна пісаць цэлыя аркушы: непасільныя, несправядлівыя падаткі, прычэпкі, непраўныя закрыцьці — вось крыжовы шлях нашай коопэрацыі.

Як жа стаіць справа ў самай Вільні?

Есьць тут Віленскі Саюз Коопэратываў, які ворагі яго завуць і бальшавіцкім гняздом, і захопленым праз палітычную беларускую кліку, але ён ня ёсьць саюзам беларускім, хоць і злучае пры сабе коопэратывы, ў якіх шмат сяброў-беларусаў.

Саюз ніяк нельга назваць беларускай арганізацыяй, ужо хоць з тых простых прыкладаў, што старшыня управы саюзу—паляк, а ў Радзе дзьве вельмі прыкметныя сярод віленскіх палякоў асобы. Саюз есьць арганізацыя-краёвая, ў якой лучацца ўсе нацыянальнасьці, а дзеля гэтага — арганізацыя ня чыста польская.

Ужо і гэта непадабаецца мейсцовай адміністрацыі, не па нутру, што Саюз— адна з нямногіх арганізацыяў, дзе беларус таксама чуе сябе чалавекам, як іншыя.

Трэба каб гэтага ня было... і ўлада ўсімі сіламі стараецца прыдусіць Саюз.

Можа і тут мы пачуем гоман, як у справе коопэрацыі на Галіччыне—дык лепей пяройдзем да фактаў.

Як вядома, па пастанове Сойму соль, тытунь і карасіна зрабіліся прадуктамі манапольнымі, г. з. што іх можа прадаваць толькі гаспадарства, або тыя асобы, каму яно гэтае права аддае. Такая перадача правоў на гандаль манапольнымі таварамі завецца канцэсыяй. Дык вось — цікава! Такую канцэсыю дасталі ўсе, хто толькі хацеў—і гуртаўнікі, і спэкулянты, толькі Віленскі Саюз замест канцэсыі атрымлівае адмову за адмовай.

Што-ж гэта за зьдзек? Гдзе прычыны, што першы лепшы спэкулянт карыстаецца большым даверыем улады, чым арганізацыя працоўнага народу — коопэратыўны Саюз?

Другі факт і сьмешны і дзікі па свайму зьместу. Па самаму строгаму закону прамысловы падатак ад чыстага даходу лічыцца ў 30 проц. ад гэтага даходу. За 1921 год Віленскі Саюз Коопэратываў меў 500 тыс. надвыжкі пры абароце больш 150 мільёнаў. Здавалася-б, што падатак ня можа быць большы, як 166 тыс., дык не—сьмешна сказаць: на Саюз налажылі падатак у 5 міліёнаў. Факт—фактам: на 500 тыс. даходу—5 міліёнаў падатку.

Пры стварыўшымся палажэньні Саюз заўсёды знаходзіцца пад Дамоклавым мячом—пагрозай закрыцьця ў кожды момант, які пакажыцца ўладзе найбольш адпаведным.

Можна быць пэўным, што такой ласкай і ўвагай не карыстаецца ў Віленшчыне ні водзін гандляр, ужо ня кажучы аб асыпаных „прывілеямі“ польскіх саюзах.

Пэўна, калі чалавека пазбавіць паветра дык ён сам задохнецца—ня трэба, каб хто быў яго палачом. І ціха і гвалтаў няма. Мусі быць і ў Галіччыне з гэтай прычыны польскае грамадзянства і коопэрацыя не заўважыла гвалтаў.

Так у нас злажыліся стасункі з уладамі.

А польскае грамадзянства, хоць і самае паступовае, маўчыць дагэтуль і маўкліва стварае адзінства фронту з клерыкальна—абшарніцкай палітыкай.

З гэтага ўсяго выцекае толькі адно:

Мы мусім прызвычаіцца і ведаць, што нам ніхто не працягне рукі паратунку, што мы самі мусім знайсьці сілы і спосабы бараніць нашу грамадзкую справу.

І. А.

✦✦✦✦

Весткі з Сойму.

Усіх паслоў, прашоўшых па беларускаму сьпіску (№ 16) у Сойм налічаецца да 12 асоб, у тым ліку адзін—па дзяржаўнаму сьпіску. Як бачым выбары нам ня зусім удаліся, бо на 40 45 паслоў, прыпадаючыя на беларускія землі, мы правялі толькі 12. Тлумачыць гэта можна толькі перашкодамі і рэпрэсыямі, якія рабіліся нам паўсямесна, але з другога боку ёсьць і наша віна, мы маглі усе як адзін стаць да галасаваньня, мы мелі магчымасьць правясьці працэнтаў 75 з усяго ліку выбраных паслоў. Статыстыка кажа, што на так зв. Усходніх крэсах галасавала да 50 працэнтаў выбаршчыкаў. Калі ад гэтага адлічыць значны лік галасоў жыдоўскіх і невялічкую частку — жывушчых тут палякаў, дык выйдзе, што беларускі народ дужа холадна аднесься да выбараў. Беларускі народ думаў, што, выбіраючы сваіх паслоў у Сойм, ён адракаецца ад сваей ідэі незалежнага бытаваньня, ад сваей нацыянальнай еднасьці. Беларускі народ страціў веру ў чужыя для яго парлямэнты—ня раз яму даводзілася кідаць галасы з надзеяй на лепшую будучыну. І вось гэта была нашая палітычная абмылка,—усе як адзін павінны былі стаць да выбараў, бо нашыя паслы пашлі ў Сойм патрэбуючы аўтаноміі, што ўжо прыбліжае да нашай найдаражэйшай мэты, пашлі, каб апіраючыся на закон, бараніць край ад полёнізацыі, каб здабыць магчымасьць беларускаму народу тварыць с в а ю культуру і эканамічны дабрабыт.

✦ У Беларускім Пасольскім Клюбе знаходзяцца такія паслы, не прашоўшыя яшчэ праз мандатную камісію:

Уладзімір Дубоўка.

I

На чужыне.

Ты дэляруеш мне долю і волю?
Мне на чужой старане трэ палацы?
Ты мне гаворыш, што зьлёт груганоў
Зьнішчыў мой край, сьмерць гняздо там зьвіла?..
Бедны ён? Пушчы? Балоты? Каменьні?
Стогнець народ пад пятой жыцьця-ката?—
Годзе! Чакаю я толькі той дзень,
Стальлю калі акуецца рука!
Вецер! Мой вольны браточак ты вецер!
Крыльля мне!.. Крыльля свае ты пазычыш!?—
Я паляту, паляту... Хай жывець
Край сасонак, кляноў і лазы!..
Дам тым вадзіцы, што б'юцца за шчасьця,
Тых пракляну, што нам Юдамі сталі...
Прыйдзе наш час, веру—прыйдзе наш час!
Вецер! Мой любы!—Чакаюць там нас...

Вясна на чужыне.

Сьнег зьнікае... Сусракаюць маладу вясну,
Сонца грэе, абуджае сьвет увесь ад сну.
Птушкі імкнуцца, супроць волі да сваіх краін,
„Час да хаты, час“.
Сьпеў чуваць адзін.
Кіну смутак я й маркоту, аж на ніцы лозы,
У вечар гэты вечар траўня, вечар нецьвярозы.
Вольны вецер я паклічу, як пяюць наўкола
„Час да хаты, час —
жыцьця майго золак“...
З ветрам, яснай бліскавіцай—ў небе паляцім,
Думкі, сэрца, кроў у жылах—усё мы адрадзім.
Толькі крыльля мне патрэбны, крыльля мне, хутчэй.
„Час да хаты, час“ —
рвецца гук з грудзей...

*

Ня трэба мне пяяць на Беларусі? —
Нас клічэ рух, пякнюткае жыцьцё!
У песьнях я—на Беларусь малюся,
Як моліцца ля возера трысьцё.
Матулі сьпеў, шматмілая старонка,
Купалы край, край чараўніц дзяўчат!
Люблю цябе, бы татачку старога,
Як дзевыньку люблю, як брата брат!
Далёка я.. Я кленчу на калені
Калі мне тут гудуць табой бары,
Віхрыцца дух і родзіць лятуцеьні
Як запяюць мне, нават камары..

Хто там вядзе аб нейкіх „ідэалах“,
Шукае ўсё дарожанькі,аж тры?—
Я лепі тых пабачыў бы на лавах...
Згубіў хто шлях—я праклінаю тых...
О, Беларусь! Я на цябе малюся,
Тваім шляхом—прыйду ў шырокі сьвет,
Паміж людзей, народаў разьліюся,
Бы вецер зух у жыце, у аўсе...

*

Захапіла навальніцаю—
Крок у крок, і сьлед у сьлед...
Празіраюць, бы й ня ніцыя,
Хмары чманыя на сьвет.
Лемантуець вецер голасна,
І віхрыцца па страсе...
Дождж палопчыць, коліць голкамі,
Бязтурботы сьпяць усе.
Выбухаюць гукі пошчакам
І зьнікаюць нібы дым.
А навокал, як нябошчыкі,
Дрэў самотныя рады.
На душы—туга сьцюдзёная,
І душа—што мітульга.
Праз прасьцяг хада штодзённая
Нельга знойдзе. А дзе ж льга?
Загалосіць вецер голасна,
Багавіньне зварухнець
І сканае з сумным гоманам
Дзесь у твані, дзесь на дне...

II

Лятуценьні.

Зданьні.

Вечар... П'яны вечар сваволі траўня...
Вецер косы ночы расплёў, дуроньнік...
Салавей пяець над ракой, як слаўна!..
Сны сьніць сасоньнік...
Гукі тыя, зданьні той цёмнай ночы
Кроў крынічаць... Млосьць захапляець волю...
Спакусіцель чорт з нас трубой рагочыць:
„Дзе-ж твая доля“?

. . . .

Кветка, выйдзь хутчэй, ня трудзі намарна,
Я чакаю сумны й маркотны ў гаю,
Час ляціць: на ўсходзе ўжо зоркі зараз
Гасяцца з краю...
Першы гоман... Раньні прачын траўня...
Вецер косы ночы заплёў, дуроньнік...
Салавей пяець над ракой, як слаўна!...
Бомніць сасоньнік..

Пацяркі.

1.

Тугой спавіта вышыня,
Істужкамі ліюцца сьлёзы...
Галосіць недзе моцна Я...
Тугой спавіта вышыня?
Няхай! Надзея вось мая:
„Усё вецер зьвее ў ніцы лозы!“
Дык війся жалям вышыня,
Дык лі істужкамі ты сьлёзы!.

2.

Час брылянцісты, залацісты
Імчыцца ў даль, як дзікі конь,
А мы на ём—убор квяцісты.
Час брылянцісты, залацісты
Настрой у сэрцы паліць чысты,
У нашым поглядзе вагонь.
Час брылянцісты, залацісты
Імчыцца ў даль, як дзікі конь.

3.

Ну чаму ж ня пяяць кажаш мне,
Калі песьні ліюцца крыніцай?
Калі ветразь мой—вір страсяне,—
Дык чаму ж не пяяць тагды мне?
Чым Баянам быць дзе ў тумане,—
У Беларусі лепш быці Зігзіцай,
Лепш хай звонам аб новай Вясьне
Разьліюцца ў Ей песьні крыніцай.

*

Не жальбую, тых дзянькоў я не шкадую,
Што жыцьцё даўно разьвеяла як дым,—
Пачакаю, пашукаю пільна тую,
Ад якой я буду зноўку маладым.
З сенажацяў, гацяў роднае старонкі,
З па надлесу, з пад тых чорных замстай хмар,
Яна прыйдзе вольным гоманам сасонкі,
Яна прыйдзе, бы вяночак дзіўных мар.
Загарацца, разжурацца, запалаюць
Мае думкі, думкі кветанькі мае.
Паліюцца песьні з краю і да краю:
То шчасьлівы й нешчасьлівы ў іх пяе.

*

Над ставам дым, бы дым з балеі,
У вербалозя сьпяць дубцы,
Свае галоўкі цымбалеі
Пад сон схілілі на капцы.

Куды пападаюць беларускія газэты.

Падпішчык газэты „Беларускі Звон" А. В. не атрымліваў газэты. Будучы арыштаваны за прадвыбарную агітацыю Дунілавіцкім Старостам быў закліканы на дапрос у памешканьне староства. Там на стале аднаго вурадніка згледзіў некалькі намяроў „Беларускага Звону", заадрэсаваны да яго знаёмых. Газэта была з маркамі і паштовымі штэмплямі. Чаму яна папала не адрасатам, а ў староства?

Падпішчык Радкевіч з Гарадокскай гміны просіць не прысылаць газэты—пры аказіі будзе асабіста атрымліваць, бо мае доказы, што газэта гіне на пошце.

Падпішчык Язэп Цыунеля з м. Казяны даўгі час не атрымліваў газэты. Пашоў на пошту Паставы даведацца і бача, што канцэлярскі стол кіраўніка пошты накрыты „Беларускім Звонам". Калі Цыунеля спытаў газэт, дык яму кіраўнік пошты адказаў, што беларускія газэты не даходзяць. Цыунеля стаў прасіць прадаць „Бел. Звон" са стала, хоць ён быў ужо абарваны і заплямены. Але не атрымаў згоды, хоць даваў за газэту тысяча марах.

Адзін падпішчык з Даўгінаўскай гміны на пытаньне чаму не даходзіць газэта, кіраўнік Даўгінаўскай пошты адказаў, што тут беларускіх газэт чытаць ня можна, а калі хто хоча, дык няхай выбіраецца ў Савецкую Беларусь.

I так без канца.

Усё гэта робіцца з верху, бо чаму ўсіх мясцовых кіраўнікоў пошты пазысылалі ў Польшчу, а на месца іх прыслалі „rdzennych" палякаў.

Дык вось, Беларускі народзе, сэрцам чуй, душой глядзі.

Каханoвіч Міхал (бел. сац. рэв.), Рагуля Васіль (сялян. радык.), Ярэміч Фабіян (бел. с.-р.), Аўсянік Антон (бел. с.-д.), Рак-Міхайлоўскі Сымон (незалеж. соц.), кс. Станкевіч Адм (род. дэм.), Мятла Пётра (беспар.), Баран Сяргей (бел. с-р.), Каціноўскі Улад. (беспарт.), Якавюк Сымон (бел. соц.-фэдар.), і Тарашкевіч Браніслаў (б. с.-д.), Сэнатары: Вяч. Багдановіч і Аляксей Назарэўскі.

◆ Адбыліся выбары прэзыдэнта. Эндэкі выстаўлялі кандыдатуру графа Замойскага, які мае 500 000 дзесяцін зямлі і не заплаціў яшчэ „даніны" 11.000 000 марак. Пасьля пятага галасаваньня выбраны Габрыэль Нарутовіч, ураджэнец б. Ковенскай губ.

◆ Беларускі Пасольскі Клюб пастанавіў ў першую чаргу паставіць ў Сойме „wnioski nagle" ў справах праўнага становішча беларускае школы, бясправных арыштаў на беларускіх абшарах, ніштажэньня беларускіх лясоў і ліквідацыі асадніцтва польскага на беларускіх землях.

◆ На першым паседжаньні пасьля выбараў Прэзыдэнта Беларускі Пасольскі Клюб мае агаласіць у Сойме прынятую на зьезьдзе ў Вільні дэклярацыю. Дэклярацыя мае быць агалошана ў беларускай мове.

◆ Беларускі Соймавы Клюб пастанавіў адлічаць ад пэнсіі сваіх сэнатараў і паслоў па 10 проц. на выдаткі Клюбу. За сьнежань адлічана з кожнага па 42 300 м. п. і апрача таго на паўтара проц. адлічак, г. з па 5.500 м. п. на карысьць Бел. Цэнтр. Шк. Рады.

◆ Ходзяць упорныя чуткі аб тым, што Сойм у хуткім часе будзе распушчаны.

◆◆◆◆

З Савецкай Беларусі.

Рассаднікі жывёлаводзтва на Беларусі.

Нар. Кам. Земляробства Беларусі на хутары „Строчыцы", Самахвалавіцкай воласьці, Менскага павету, распачата арганізацыя развядзеньня племянных птушак і дробнага жывёлаводзтва. Лік гатучковай курыцы „Мінор" у гэтым годзе праэктуецца давесьці да 500 штук, трусоў да 100 пар, гусей, вутак і індыкоў да 400 штук.

У Савецкай гаспадарцы „Самуэлева" (Самалёва") арганізуецца рассаднік кароў швіцкай (Швэйцарскай) пароды.

У сучасны момант у гаспадарцы маецца каля 30 галоў швіцкіх кароў і 40 коняў.

У Саўхозе „Велень", Навасёлкаўскай воласьці, Ігуменскага павету, маецца рассаднік сьвіней белай ангельскай пароды і стада галяндзкіх кароў.

М. В.

Весткі з Менску.

◆ У Менску атрымана 25.000 беларускіх падручнікаў і 15.000 лемантароў, надрукаваных у Бэрліне. Кнігі гэтыя будуць разсылацца для школ па паветах.

◆ Арганізуецца усебеларуская выстаўка, характэрызуючая вытворчую, прасьветную і іншую працу ўсіх камісарыятаў Беларусі.

◆ Рынковыя цэны. Жыта 1000 р. пуд, авес 800 р. пуд, ячмень 8825 р. пуд, мука жытняя 1125 р. пуд, мука пшанічная лепшая 112 5 фунт, хлеб чорны 31 р. фунт, булба 204,2 р. пуд, хлеб белы 55,5 р. фунт, сена 517 р. пуд, мяса 148 р. фунт, сала 46 ,5 р. фунт, масла салёнае 550 р фунт, малако 140 р. кварта, цукар рафінад 700 р. фунт, пясок 320 р. фунт, соль 26 р. фунт, мыла 245 р. фунт махорка 247,5 р. фунт, гарбата 1950 р. фунт, газа 57,5 р. фунт, сярнікі 100 р. дзясяток.

Гэткія цэны стаялі ў канцы лістапада.

◆◆◆◆

Маленькі фэльетон.

„Слюбуюць".

Я таксама кідаў картачку з № 16 і вось мяне вельмі зацікавіла як там і што там у новым Сойме. Але каб паехаць у Варшаву, дык трэба хіба чорту душу прадаць, каб аплаціць дарогу, якая ледзь ня штодня даражэя. У трудных часінах я маю прывычку зьвертацца да народу, ён заўсёгды паратуе, паможа. Зьвярнуўся і цяпер. Адна бабулька-варажбітка дала мне дыван самалёт і шапку невідзімку і я гікнуў, ахнуў, пух! і апынуўся ў самым Сойме. Слухайце-ж.

— Здраствуйте, господин сенатор!

— Здраствуйте, господин посол! Вы откуда?

П. Да из Клюбу Беларускіх Паслоў.

С. Ну как?

П. Слюбую. А вы?

С. Я хоть и в новой кожа, да сердце ў меня всё тоже.

П. А ведь чудныя времена перёживаем?

С. Да, действительно. Николаю слюбовалі, большевикам слюбовалі, а тепер полякам .. Знаете, я на всякій случай вучуся гаманіць—чем чорт не шутит, а вдруг придется еще адну незалежнасьць переживать и опять слюбоваць.

П. Вот я то и примазался. Ну, а как вы насчет того товара?

С. Сделка подходящая — слюбую.

Тут гутарку іхнюю перабіў другі пасол, які заявіў, што палякі сарвалі вывеску: „Беларускі Пасольскі Клюб" з дзьвярэй памешканьня Клюбу. Што далей будзе — паведамлю. Баюся толькі што гэтыя гаваруны могуць цяпер не найсьці свайго клюбу і заблудзіць у другі.

Выбаршчык.

◆◆◆◆

Допісы.

М. Вязынь, Вялейшчына. Вось сабяромся мы калі грамадой і пачнем разважаць, што маркотна, дрэнна нам жывецца, што мала мы ад палякоў добрага пераймаем, маем: школ нам не даюць, каапэратывы прасьледуюцца, газэты, не кажучы ужо аб беларускіх, не даходзяць і тыя, якія ня клічуць біць беларусаў, жыдоў, а пойдзіш у касьцёл там не даюць рая без пакоры пану. Вось так і жывем як ваўкі ў лесе. Адно чаго мы вучымся, дык гэта панства, хванабэрыі. Есьць у нас такія бульбаеды, якія знаючы прыпадкова польскую мову, праз сваю цемнату, лічаць сябе вышэй за суседзяў сермяжнікаў. Гэта патрохі тлумачыцца тым, што беларусы маюць прадстаўленьне аб польскім народзе па мейсцовых абшарніках, якія калісь назлеталіся сюды з Польшчы. Значыць, калі паляк, дык пан, шляхціць. Гэта ёсьць ня праўда, бо польскі працоўны народ таксама сароміцца і ня любіць сваіх паноў, вядзе з імі барацьбу і спагадае нам. Дык няма чаго нам падрабляцца пад шляхоцкую скуру, бо яна нам зусім не пасуе і зневажае нашае пачуцьцё.

Гэта трэба ведаць войту нашага мястэчка і яго пісару. Калі зайдзіш у гміну, дык войтавага носу і качаргой не дастанеш, а тым часам паступкі яго дужа несамавітыя. Аднэй ночы свайго бязупыннага пьянства войт з пісарам пачалі стукацца а 12 гадзіна да мястачковага гаспадара, каб пусьцілі яго. Прыняўшы пад увагу хворасьць гаспадара, позную пару і гвалтоўныя, пьяныя дамаганьня войта гаспадыня не адчыніла дзьвярэй; тады войт узяўша кол. ударыў па вакне, разбіваючы яго да шчэнту, а пісар, каб услужыцца начальству, разбіў два вакны. На крык хатніх зьбегся народ і адагнаў пьяніц.

Х—м.

Няпрошаныя госьці. У вёску Баяны, Слонімскага павету а 10 гадзіне ўвечара прышло 6-ць жаўнераў да хаты селяніна Яна Маслоўскага.—Мы чулі, кажаць яны, што ў вас сягоньня вечарына, прышлі пагуляць.

Па небе мітусяцца хмары:
Вятры з іх штучны ткуць дыван.
Начы клубком спляліся мары:
Каханьне, віры, гасу ган.
Куды імкнуцца, што паклікаць.—
У кветках ложак наш—дзірван...
Між зёлак пахлых і пад ліпай
Узкоўдрыць нас з табой туман...
Жыцьцё,—гарэлкі пеннай чарка,
Жыцьцё, атруты чарка,—згінь!..
Не разьбівай ты нашай мары:
У свой часвозьмеш ўсе даўгі...
*
Ноч наплакалі бяробы
Нашумеў чарот,
Падыйшла яна з пагрозай,
Стала за гарой.
Гадам, гужам разпаўзьліся
Туманы наўкол,
Забялілі бельлю лісьця
Нібы малаком.
Вецер шэпты разпаўсюдзіў,
Сьпеў цымбалаў сьпеў...
Дзе ты кветка? Сьпіць лес, людзі,
Месяц змаладзеў...
А ні слова, а ні гуку
Не ляціць у адказ.
Толькі недзе „ку-ку, ку-ку"
Чутна раз пад раз ..
*
Імжа, і склізота, і прыкрая золь
За скрогатам ветру—навалай.
У чмарнасьць убралася сьветная столь,
Блакіт ад зямлі адарвала.
Кудлатай лазой расплялася журба,
Цярушыцца шэраньню ў сэрца.
Душа—ў падарожы жахлівы жабрак,
Наўкол—непакойныя гэрцы.
I скогат, і скарга, ня скеміць што скуль:
Вялізманны восенны вераск.
Угрунь і угрунь, не ля мэты пакуль,
Праз стромы, амшары, праз верас...

III

Адраджэнцам.

Спагадае хто?

Прысьвячаю Габрылю Г.

Ты, хто сын працоўнай вёскі,
Ты Рагнедзіна дачка,—
Бач: з бель-беленькай Бярозкі
Разьлілася сьлёз рака.
Спагадае хто бяздольнай?
Запалае ў кім вагонь?
Хто рукою цнотнай здольнай
Закілзае жыцьцё—гонь?—
Маладое пакаленьне,
Прачынайся, час прышоў.
Залатое Адраджэньне
Клічэ ўсіх пад родны схоў.
Годзе хмарамі бадзяцца:
Бездарожжа ломіць скронь!
Мусіць дбаць аб шэрай хатцы—
Розум, сэрца і—далонь!
Кроў у нас хай закрынічыць,
Завіхрыцца дух вірам,
Хай імпэт наш чараўнічы
Бомкне гора пяруном!
Маладое пакаленьне,
Прачынайся, час прышоў.
Залатое Адраджэньне
Клічэ ўсіх пад родны схоў.
*
Мітусіцца лістота мяцеліцай
Мітульжыная быццам дзьвіна.
Па аселіцы лёнам пасьцеліцца,
Завіхрыцца квяціста яна.
Супаратная строма васеньняя
Мае грудзі сьціскае ў праклён,
Яе стромкая песьня вясельная
Не аздобіць стацьцё чорных дзён.
Вецер ліст разсыпае прыгоршчамі,—
Гэта замста на мары мае,—
За ціжары валотныя горшую
Сухазлотную шату дае.
Ну дык што! Ну дык што! Пад ціжарамі
Мне няйсьці, шчасьць там не шукаць:
З за балота мігціць, за выгарамі
Ужо праменіць пярэстая гаць.
*

Прысьвячаю Міхасю Лойцы

Прыпыніла свой голас жалейка:
Мусіць сьлёз ужо болі няма.
Адгулялі на скрынцы батлейкі,
Адцьвіцеў кармазынавы мак.
Журавы паляцелі далёка—
З імі жальба, бядота мая.
I шукае навокала вока:
Дзе прыпынак і дзе мой маяк?—
Там, дзе нізка схіліліся хаты,
Ля ракі дзе гамоніць аір!
Там, дзе ў пушчы па хвоях кудлатых
Мігацяць Беларусі страі!
З грамадою агністаю, раптам,
Я—туды накірую свой крок,
I да мэты жыцьцёвай патраплю!—
„На шчыце ці з шчытом"—вось зарок!

На сьвята Алеся Гаруна—ў Маскве
2 красавік. 22 г.

Ад Крывіцкіх балотаў, да тундраў Сыбіру,
Ад аковаў душы, да цяжкіх ланцугоў,—
Ты пяяў неупынна, званіў сваёй лірай,
Заклікаў нас на родныя гоні дамоў.

„Беларус, схамяніся". „Хутчэй прачынайся",—
Вось што чулася мне ў пекных вершах тваіх,—
„Родны край свой кахай"... „Мовы ты не зракайся".
Так пяяў наш Гаротны, будзіў нас і... сьціх...

Раўнаваўшы сябе да зялёнага дубу,
Што на сьмерці кідае дубкоў маладых,
Цэлы лес абудзіў ты, але-ж тваю згубу
Помніць ён і сумуе, да дзён аж да тых.

Раўнаваўшы сябе да ручайкі малой
Што зьвініць па карэньнях, цячэць цёмным борам,
Ты, па праўдзе, быў слаўнай, вялікай ракой
I яна ў гэты час разьліваецца морам...

Ты хацеў, салавей наш, хацеў хоць калі,
Хоць адзін пачуць сьпеў свой і-з вуснай дзяўчыны,
Устань, прыйдзі, наш Гаротны, з сьцюдзёнай зямлі,
Твае сьпевы зьвіняць у твае вечарыны...

Ты ня йдзеш? Не чакаў ты, песьняр малады,
Беларусь каб цябе кожны год памінала?
Ты маўчыш?—Хай-жа ймчыцца ў вякі і гады
Гэты звычай, і памяць табе, а з ёй—хвала!
*
Балаты разлягліся абапал ракі,
I дрыгва і гідота, дзе вокам ня кінь.
Да зямлі прытуліліся дрэўцы, кусты.
Разьлягліся абапал ракі балаты.

Усё маўчыць, толькі драч затурчыць між травы,
Ды плывуць па рацэ ад балота плавы.
Чутны стогны багны, чутны кігаўкі плач.
Заціхаець і гэта, турчыць толькі драч.

Засмактала балота... Кіёўкі адны
Не спужаліся гідаснай цемры, багны:
Да сьвятла заклікаець галовак іх лёт.
Не задушыць ніколі іх здрада балот!

Чытай! Распаўсюджывай! Падпісывайся!

Хто жадае вольнай і сьветлай будучыны для Беларусі, каму дорага справа яе адраджэньня, хто шануе матчыну мову і змагаецца за праўду працоўнага люду хай падпісываецца на газэту **„Наша Будучына“** і усюды пашырае яе. Хай у кожным занепалым кутку Беларусі пазнаюць і прыхінуцца да **„Нашай Будучыны“**, якая

хаець сумную сучаснасьць,
раскрывае варожыя замыслы,
выражае і крысталізуе думкі народу,
адкрывае новыя праўды,
бароніць заваёванае і здабытае крывавым мазалём,
будзіць творчы дух да волі і харавтва і
паднімае ўзрост роднай культуры.

Друкованае слова мае аграмаднае значэньне ў змаганьні за дабрабыт Краю, за лепшую будучыну.

Ворагі гэта разумеюць і ніштожаць, як сваю небасьпеку, беларускія газэты на поштах, пры вобысках і г. д.

І мы павінны зразумець карысьць ад свайго друкованнага слова, павінны выпісываць **„Нашу Будучыну“** і складаць ахвяры, каб забясьпечыць ёй доўгае бытаваньне і бараніць ад напасьці самавольнікаў.

Каб гэтая часопісь была сапраўднай вашай газэтай і шматчаканай будучынай, дык кожны надпішчык павінен быць і яе супрацоўнікам. Каб беларус з пад Нёмана ці Дзьвіны знаў, чаго дамагаецца і як жывець пінчук, альбо беларус, які жывець на чужбіне. Толькі аб'едданыя беларускай працоўнай праўдай, злучаныя ў адналітую грамаду мы дружнай працай даб'ёмся нашай пакутнай Бацькаўшчыне належучую ёй лепшую долю і вольную будучыну.

Рэдакцыя.

Гаспадар ім растлумачыў, што ніякай вечарыны няма і ня будзе. Тады яны запыталіся ў Маслоўскага ці праўда, што ён нядаўна прыехаў з Амэрыкі. Атрымаўшы запэўнены адказ, закурылі папіросы і вышлі з хаты. І вось а гадзіне першай уначы уваліваюцца ізноў у хату і пачынаюць біць Маслоўскага. Хатнія паднялі крык а помачы. Тады жаўнеры выбегшы розбілі усе вокны.

Ю. Б.

З Беларускага жыцьця.

Ф. Аляхновіч напісаў новую апэрэту „Дзед і баба“.

Н. Арсеньнева перакладае на беларускую мову „Dziady“ А. Міцкевіча.

Макар Косьцевіч пераклаў на беларускую мову „Мцыры“ Лермантава.

У суботу 9 сьнежня ў памешканьні Беларускага Грамадзянскага Сабраньня адбыўся спэктакль. Згулялі пьесы: «Блёндынка і брунэтка» і „Я памёр“ жарты ў адным акце. Публікі было мала. Калі і далей будуць такія праступна-нехайныя адносіны артыстаў да беларускага тэатру, дык больш ніхто ня пойдзе.

М. Гарэцкі напісаў хрэстаматыю беларускай літэратуры за перыяд ад XI в. да 1905 г. Хрэстаматыя хутка выйдзе з друку.

Беларускі вечар. 19-га сьнежня ў залі Драматычнае Майстроўні адбудзецца вялікі вечар з багатай праграмай, чысты даход з якога пойдзе на карысьць бяднейшых вучняў гімназіі.

Пастаўлена будзе апэрэта „Іваноў Павал“ у двох актах пабеларуску. Вучні гімназіі прадэклямуюць вершы у беларускай, расейскай, нямецкай, польскай, францускай і жыдоўскай мовах, а такжа некалькі намяроў мелёдэклямацыі. Хор прапяе народныя песьні. Пад кіраўніцтвам п. Альшэўскай вучні выканаюць беларускія народныя танцы. Лятэрэя, габінэт цудаў і іншыя цікавыя нечаканкі. Пачатак а 7 г. вечара. Танцы на залі да 5 г. раніцы.

Трэба спадзевацца, што усё беларускае грамадзянства гор. Вільні пажадае высказаць спачуцьцё дабрадзейнай мэце і густа прыбудзе на вечар.

Беларускія вучыцялі, якія знаходзяцца на курсах у Кракаве, на Каляды звальняюцца на тры дні. Курсы кончацца прыблізна ў канцы студня 1923 г.

Гр. Сымон Рак-Міхайлоўскі, які ў інтарэсах беларусызацыі царквы, у свой час увайшоў у склад Віленскай Праваслаўнай Духоўнай Кансысторыі, як беларус-нацыяналіст, цяпер, з прычыны абраньня яго дэпутатам у Сойм і пераезду ў Варшаву, вышаў з складу сяброў памянёнай Кансысторыі.

Пісьмы і тэлеграмы на імя паслоў адрэсуюцца: Warszawa, Sejm, Posłowi (прозьвішча пасла), **а на імя сэнатараў:** Warszawa, Senatorowi [прозьвішча сэнатара).

Беларускі Пасольскі Клюб кожную нядзелю прымае па усіх справах у памешканьні быўшага Цантральнага Выбарнага Камітэту, Вільня, Віленская 12-6.

Беларуская вечарынка ў г. Нясьвіжы.

1-га сьнежня у г. Нясьвіжы ў залі Ратушы адбылася Беларуская вечарынка на карысьць незаможных вучаніцаў Нясьвіжскай мешаннай Беларускай Гімназіі. Вучнямі былі згуляны дзьве п'есы: „У восень“— Свідэрскага і „У кавалёвай хаце“— Л. Родзевіча. Усе ролі праведзены з адпаведным настроем і удачна.

Пасьля прэдстаўленьня дзьве вучаніцы V клясы надта прыгожа станцавалі матроскі танец „Матлёт“.

Гімназіяльны хор пад кіраўніцтвам настаўніка Я. Шнаркевіча прапяяў беларускі гімн і беларускія народныя песьні. Пасьля кожнай песьні публіка працяглымі воплескамі вітала хор. Асабліва моцнае уражэньне зрабіла песьня „Бульба“, якую хор прымушан быў паўтарыць яшчэ раз. Публікі было шмат. Вечар даў добры збор.

Нясьвіжанік.

З жыцьця беларускіх студэнтау.

У Празе.

У Празе 5 XII-22 г. адбыўся агульны сход беларускіх студэнтаў. Выбраны новы прэзыдыум у складзе: Вершынін, Т. Грыб, Мамонька, Верамей і Шышкоўскі.

Новы Прэзыдыум робіць захады перад чэскім урадам аб адкрыцьці ў Празе Беларускага Вучыцельскага Інстытуту. Разлічана на 50 асоб.

Есьць надзея атрымаць на будучы год новыя пяцьдаесят стыпэндый для студэнтаў і тры для прафэсароў (Гісторыя беларускага народу, гісторыя беларускае літэратуры і беларускай мовы).

Чэхі адносяцца вельмі прыхільна да думкі адкрыцьця Беларускага Вучыцельскага Інстытуту—трэба спадзявацца, што ў лютым ці сакавіку Інстытут будзе адчынены.

Студэнты маюць свой добра пастаўлены хор. Рыхтуюцца да пастаноўкі „Паўлінкі“ Я. Купалы.

У Вільні.

На зьезд славянскіх студэнтаў у Празе дэлегуюцца студэнты: Грынкевіч, Мазалеўскі і Малафееў.

Беларусы, жыды і палякі-соцыялісты два гады дамагаліся прапарцыянальных выбараў у Раду Акадэміцкай Моладзі, у склад якой уваходзілі толькі вшэхпалякі—абшарнікі. 12 сьнежня адбыўся бурны сход Віленскіх студэнтаў, на якім беларусы, жыды і палякі соцыялісты, посьле правалу іх прапазыцыі, аб'явілі байкот Радзе Акадэміцкай Моладзі.

Гэтая-ж опозыцыйная частка студэнтаў выступіла з вострым пратэстам супроць прыняцьця „numerus klausus“ адосна жыдоў, рашуча адкідаючы ўсякія аграніччэньні і перашкоды ў атрыманьні прасьветы.

Малюнкі Я. Дроздовіча.

Давялося мне бачыць малюнкі Я. Драздовіча, якія па некалькі штук знаходзяцца ў Беларускім музэі, ў кнігарні і ў Грамадзянскім Сабраньні.

Яз. Драздовіч, ня гледзячы на сваё вандроўнае жыцьцё і цяжкае матэрыяльнае становішча ўсё-такі шмат творыць. Кожны год дае навінкі. Час было б яму падумаць аб выстаўцы сваіх малюнкаў. Вельмі багатае ўражаньне робяць яго працы графікай. У партрэтах старых беларускіх князёў чуецца моц духовая нашых продкаў. Выкананьне закончанае. Відаць мастак доўга і старанна студ'яваў, каб стварыць воблік полацкага князя.

Шмат мастацкага пачуцьця і фантазіі ўложана ў малюнкі, працстаўляючыя старыя гарадзішчы, першабытныя хаты беларуса і інш. Тут Драздовіч здалеў ухапіць пачаткі архітэктурнага мастацтва, даў пачуць беларускі стыль, моц творчасьці па будаўніцтве ў нашых продкаў.

Што да другіх малюнкаў робленых хварбамі, дык іх не зразумееш без тлумачэньня аўтара. Вельмі ўжо заплутаная сымволіка, шмат наіўнага, хворага і чужое для нашага духа.

Віленец.

Свая пошта.

Гр. Я. Шнаркевічу. Пішыце, што ў Вас чуваць. Газэту пасылаем — распаўсюджывайце.

Гр. Змітраку Бядулю. Шмат хто з віленскіх беларусоў чакае ад Вас перакладу Бяліка на беларускую мову.

До Украинского громадянства.

Загальне Зібрання Українськоі эмігрантськоі Колонії, яке відбулося в Варшаві при Дирекціі Українського Цэнтрального Комітэту в Польщі 10—XI--1922 р., звертаетеся до Українського громадянства, перебуваючага поза кордоном України на эміграції, з закліком і прозьбою прикласти всіх зусіль для переведення збірки на Різдвяний подарунок інтернованым в Польщі козакам і старшинам Українськоі Арміі, памятаючи, що майнэ вся інтернована в Польщі армія У. Н. Р., не дивлячись на тяжке життя своє в стані інтернації, —вже два роки—герсічно несе свій хрест моральних страждонь і матеріальних недостатків і непохитно стоіть за ту саму ідэю, за яку боролася з початку Російськоі революціі.

Отже, Загальне Зібрання Українськоі Колоніі в Варшаві, розсилаючи до громадянства українського окрему відозву, просить звернути пильну увагу на потреби інтернованих козаків і старшин та в міру сил і можливости офірувати чи гроши, чи річі, особливо ж одіж, білизну і взуття.

Збірочною акціею керує Жіноча Підсекція при Українському Центральному Комітеті, на чолі якоі стоіть п. Олена Івановна Лукасевіч, котра ласкаво взяла на себе всю організаційну і віконавчу роботу в цій справі і до котроі належить надсилати всі пожертви па адресу: Warszawa, ulica Miedziana Nr. 10, m. Nr. 17.

Дирекція Україн. Центр. К-ту.

Абвесткі.

†

Пасьля трагічнага выпадку і цяжка перанесянай апэрацыі 9-га сьнежня памёр наш любімы сын

Нюта Бачкароў.

Аб гэтым горы паведамлюць сваякоў і знаёмых глыбока засмучаныя.

Бацькі.

Паведамленьне.

Аб конкурсе на сцэнічныя творы.

Дзеля таго, што ўладаю часова спынена чыннасьць Беларус. Музык. Драм. Гуртка і справа аб узнаўленьні яго дзейнасьці перададзена ў Міністэрства ўнутрэніх спраў—усе абавязкі па абвешчанаму Гуртком конкурсу пераніме на сябе Грамадзянскае Сабраньне, якое ў хуткім часе паведаміць, а тэрміне раздачы прэміяў.

Аб спатканьні Новага Году.

Белар. Грамадзянскае Сабраньне ладзіць для сваіх сяброў і іх гасьцеў агульнае спатканьне Новага Году. Будзець пастаўлена мініатура, дывэртысмэнт і фээрычэскі абраз паяўленьня Новага Году. Пасьля вячэры танцы да 6-й гадзіны раніцы. Запісь на столікі прыймаецца ў канторы клюба. Уваход па імяных білетах, якія будуць выдавацца пры запісі.

Рэдактар-выдавец А. АМЕЛЬЯНОВІЧ. Друкарня „ДРУК“ Субач, 2.